# *Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна*



## *Шаноўныя сябры!*



Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна з'яўляецца адукацыйным, навуковым і культурным цэнтрам Беларускага Палесся.

Створаная ў 1944 годзе ВНУ мае багатыя традыцыі і высокую рэпутацыю ў сферы падрыхтоўкі педагагічных кадраў.

За перыяд дзейнасці ўніверсітэта падрыхтавана больш за 30 тысяч спецыялістаў. Мы ганарымся сваімі выпускнікамі, сярод якіх вядомыя навукоўцы, заслужаныя настаўнікі, алімпійскія чэмпіёны. Станоўчыя водгукі ад работадаўцаў сведчаць пра высокую якасць падрыхтоўкі, актыўную жыццёвую пазіцыю і высокі інтэлектуальны патэнцыял нашых выпускнікоў.

МДПУ імя І.П. Шамякіна дынамічна развіваецца і ўмацоўваецца на міжнародным рынку адукацыйных паслуг. Укараняюцца самыя новыя тэхналогіі і методыкі навучання, ствараецца сучасная матэрыяльна-тэхнічная база, інфармацыйна-адукацыйная сетка.

Сёння ў складзе ўніверсітэта 9 факультэтаў:

- *біялагічны;*
- *дашкольнай і пачатковай адукацыі;*
- *інжынерна-педагагічны;*
- *тэхналогіі;*
- *фізіка-матэматычны;*
- *фізічнай культуры;*
- *філалагічны;*
- *даўніверсітэцкай падрыхтоўкі і прафарыентацыі;*
- *павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.*

Вучэбны працэс забяспечвае 31 кафедра. Маюцца спецыяльныя прадметныя аўдыторыі, комплекс лабараторый і майстэрняў, абсталяваныя камп'ютарныя класы, бібліятэка, спартыўныя залы, добраўпарадкаваныя інтэрнаты. Падрыхтоўка кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі ажыццяўляецца праз аспірантуру ВНУ.

У 2011 годзе Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна паспяхова прайшоў чарговую дзяржаўную акрэдытацыю. Акрамя таго, атрыманы сертыфікаты адпаведнасці сістэмы менеджменту якасці патрабаванням СТБ ISO 9001-2009 у Нацыянальнай і DIN EN ISO 9001-2008 у нямецкай сістэмах.

Актыўна развіваецца навуковая дзейнасць ВНУ. Атрымана пасведчанне аб акрэдытацыі на статус навуковай арганізацыі.

Калектыў універсітэта вызначаецца высокім творчым патэнцыялам, грамадзянскай і палітычнай сталасцю, што дазваляе актыўна вырашаць задачы па ўсебаковым развіцці маладога пакалення.

**Сардэчна запрашаем у наш універсітэт!**

*Валянцін Васільевіч Валетаў,*
*рэктар універсітэта, доктар біялагічных навук, прафесар*